# ГІСТОРЫЯ І БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА

**В. Б. Антоненка**

## ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА Ў КАМУНІКАТЫЎНАЙ ПАМЯЦІ СЯМ'І

Памяць – гэта адна з самых каштоўных і неад’емных якасцяў, уласцівых чалавеку. Але паступова сыходзяць з жыцця людзі, памяць якіх захоўвае ў сабе ўсе этапы станаўлення савецкай улады, даваенны час, жахі ваенных гадоў і пасляваенны перыяд. Каб разумець ход гістарычнага развіцця сваёй Радзімы, трэба стварыць ва ўласным разуменні жывую карціну мінулых гадоў. Бясцэнную дапамогу ў гэтым могуць аказаць размовы з непасрэднымі ўдзельнікамі гістарычных падзей. У класічнай працы Яна Асмана «Культурная памяць. Ліст, памяць аб мінулым і палітычная ідэнтычнасць у высокіх культурах старажытнасці» вучоны сфармуляваў тэарэтычныя асновы вылучэння культурнай і калектыўнай памяці. Таксама ў яго працы разглядалася камунікатыўная памяць, якая адносіцца да калектыўнай памяці. Камунікатыўная памяць – гэта памяць, зафіксаваная ў мове і ў працэсе зносін. Падобным прыкладам камунікатыўнай памяці з'яўляюцца урыўкавыя звесткі, якія доўгія гады перадаваліся ў маёй сям'і, пра прадзеда Міхайлава Емяльяна Паўлавіча і яго сына (дзеда) Міхайлава Паўла Емяльянавіча, жыццё якіх прайшло праз асобныя этапы айчыннай гісторыі. Асноўнымі крыніцамі для напісання працы сталі дакументы, узнагароды і фатаграфіі, якія захаваліся ў маёй сям’і.Праца абапіралася на ўспаміны трох пакаленняў – мамы, бабулі, прабабулі.

Міхайлаў Емяльян Паўлавіч у гады Вялікай Айчыннай вайны ваяваў на I Украінскім фронце, прымаў удзел у наступных аперацыях: абарона Масквы, Арлоўская аперацыя Бранскага фронту, Бранская аперацыя 1943г., Гомельская аперацыя,Зімовы наступ Украінскага фронту, Ровенска-Луцкая аперацыя, Львоўска-Сандамірская аперацыя. За мужнасць і гераізм быў узнагароджаны медалём За адвагу. У канцы 1944 г. падарваўся на міне, перанёс мноства аперацый, але больш ніколі не стаў на свае ногі. Яго сын, Міхайлаў Павел Емяльянавіч прымаў удзел у завяршальным этапе II Сусветнай вайны (у разгроме Квантунскай групоўкі). Узнагароджаны медалём За перамогу над Японіяй, ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

Не выбірае чалавек час і месца свайго жыцця. Не можа жыццё асобна ўзятага чалавека праходзіць незалежна ад жыцця грамадства і краіны. Гісторыя перапісваецца з вялізнай хуткасцю, факты мяняюць на зручную новую праўду, і ўжо не зразумела дзе сапраўды гісторыя, а дзе чарговая выдумка. Каб подзвіг маіх сваякоў і іншых мільёнаў салдат бясследна не адышоў у нябыт, мы павінны вывучыць гісторыю сваёй краіны. А больш сумленнага апісання падзей мінулых часоў, чым апісанне, якое далі тыя хто бачыў усе

сваімі вачыма, быць не можа. Таму варта збіраць сямейную гісторыю, пакуль гэта яшчэ магчыма з тымі, хто бачыў гэтую сапраўдную гісторыю, каб ведаць праўду і захоўваць памяць.